УДК 930. 1(09) (БЕИ)

# БЕЛАРУСКІЯ ПАЛІТЫЧНЫЯ ПАРТЫІ І АРГАНІЗАЦЫІ Ў ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў 1921-1939 гг. У АЙЧЫННАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ 20-80-х ГАДОЎ

А.А. Савіч

Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С. Пушкіна, г. Брест

Адной з найбольш важных тэм гісторыі Заходняй Беларусі 1921-1939 гг. з'яўляецца праблема дзейнасці беларускіх палітычных партый і арганізацый. У савецкія часы на распрацоўку названых пытанняў узмоцнены ўплыў аказвалі рознага кшталту дзяржаўна-партыйныя ідэалагічныя структуры з мэтай накіраваць вывучэнне названых пытанняў у неабходным для іх накірунку.

З самага пачатку беларускі нацыянальна-вызваленчы рух аказаўся, нягледзячы на агульную, за некаторым выключэннем, незалежніцкую антыпольскую, антыакупацыйную накіраванасць, падзелены на некалькі плыняў, прадстаўнікі якіх кожны па-свойму ўяўлялі сабе будучыню Заходняй Беларусі, і ўвогуле сваёй Бацькаўшчыны. Безумоўна, такое становішча далёка не спрыяла поспеху ў барацьбе, а хутчэй наадварот. Дзейнасць камуністычных арганізацый, а потым і Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі (КПЗБ), якая ўтварылася ў 1923 г. і ўзначаліла рэвалюцыйную, сацыяльна-класавую, левардыкальную плынь у нацыянальна-вызваленчым руху, ставіла сваёй мэтай на падставе рэвалюцыйнай барацьбы дабіцца перамогі сацыялістычнай рэвалюцыі, уз'яднання Заходняй Беларусі з БССР і ажыццявіць сацыялістычныя пераўтварэнні накшталт тых, якія ўжо былі праведзены ў савецкай Беларусі. У сваёй паўсядзённай практыцы прадстаўнікі левардыкальнага крыла ўсяляк прапагандавалі дасягненні БССР у сацыялістычным будаўніцтве. Пад уплывам КПЗБ знаходзіліся ў розныя часы рэвалюцыйна-дэмакратычныя арганізацыі: Беларуская сялянска-рабочая грамада і арганізацыя "Змаганне".

Прадстаўнікі нацыянальна-дэмакратычнай плыні (Беларуская хрысціянская дэмакратыя (БХД), Беларускі сялянскі саюз (БСС), Цэнтральны саюз культурных і гаспадарчых арганізацый ("Цэнтрасаюз") і іншыя) у нацыянальна-вызваленчым руху ў Заходняй Беларусі па-іншаму ўяўлялі сабе перспектывы развіцця беларускай дзяржаўнасці, не адмаўляліся ад супрацоўніцтва і ўзаемакантактаў з іншымі так званымі непралетарскімі палітычнымі арганізацыямі.

Савецкая гістарыяграфія па ідэалагічных прычынах рэзка адмоўна, а часта і варожа, ставілася да дзейнасці ў Заходняй Беларусі партый і арганізацый нацыянальна-дэмакратычнай плыні. За прадстаўнікамі гэтых партый трывала замацаваліся фармулёўкі, накшталт "беларускія буржуазныя нацыяналісты", "згоднікі", "здраднікі" і іншыя.

Асноўная ж увага, асабліва да пачатку 90-х гадоў, надавалася даследаванню пытанняў гісторыі станаўлення і развіцця рэвалюцыйнага руху ў розных формах яго праяўлення.

Першыя крокі ў вывучэнні палітычных партый і арганізацый ў Заходняй Беларусі былі зроблены ў 20-30-х гадах, калі ў БССР працавалі спецыяльныя навуковыя ўстановы: Камісія па вывучэнню Заходняй Беларусі, заходні сектар Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КП(б)Б і Інстытут польскай пралетарскай культуры. Іх галоўнай задачай было даследаванне заходнебеларускай праблематыкі.[1] Ужо тады былі сфармуляваны асноўныя падыходы да вывучэння акрэсленых праблем, прычым падзел на "сваіх" і "чужых" выяўляўся ў самых безапеляцыйных формах.

У 20-я гады значная ўвага надавалася асвятленню розных бакоў дзейнасці КПЗБ, як галоўнай, авангарднай сілы, якая ўзначальвала рэвалюцыйную барацьбу насельніцтва Заходняй Беларусі. Напрыклад, аўтары брашуры "Аб клясавай барацьбе ў Заходняй Беларусі ў часы Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады" (Мн., 1932) давалі наступны пералік спраў КПЗБ: наладжванне дэманстрацый салідарнасці прамысловага пралетарыяту з супрацьпадаткавым змаганнем сялян, змаганне за права нацый на самавызначэнне, аж да аддзялення, арганізацыя змагання з камасацыяй, дэмаскаванне польскага імперыялізму ў падрыхтоўцы вайны з СССР, вядзенне барацьбы супраць праследавання беларускіх школ, беларускага настаўніцтва, беларускіх служачых, няўхільнае тлумачэнне масам здрадніцкай контррэвалюцыйнай ролі правадыроў згодніцкіх арганізацый у Заходняй Беларусі і іншае.

У гістарычнай літаратуры тых гадоў асвятляліся таксама пытанні стварэння КПЗБ, прычым у пачатку 30-х гадоў з'явіўся тэзіс аб тым, што КПЗБ утварылася з арганізацый КПРП, якія праводзілі сваю працу ў буйных гарадах Заходняй Беларусі яшчэ да стварэння КПЗБ. Такім чынам, гэтак званая тэорыя "двухкарэннасці" КПЗБ, згодна з якой КПЗБ утварылася з арганізацый КПРП, Беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі (БРА) і некаторых дробнабуржуазных нацыяналістычных арганізацый, абвяргалася[2].

Заўважым, што гэтая выснова была зроблена пасля рэпрэсій з боку савецкіх уладаў у адносінах да былых кіраўнікоў БРА, якія разам з іншымі актыўнымі ўдзельнікамі рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі выехалі ў БССР у выніку абмену палітвязнямі паміж СССР і Польшчай. Да гэтага часу дзейнасць БРА не падвяргалася крытыцы. Пасля вышэйузгаданых рэпрэсій у беларускай гістарычнай літаратуры былі зроблены высновы пра тое, што КПЗБ, прымаючы ў свае шэрагі БРА цэлай арганізацыяй, зрабіла вялікую палітычную памылку таму, што разам з часткай сапраўдна па-камуністычнаму настроеных элементаў такім шляхам пралезлі ў КПЗБ група буржуазных нацыяналістаў, якія ўступілі ў кампартыю з мэтай узначалення рэвалюцыйнага руху і разгрома яго знутры[3].

Не маглі даследчыкі пакінуць у баку пытанне аб гэтак званай "сэцэсіі" у КПЗБ. Не ўдаваючыся ў падрабязнасці справы, аўтары публікацый спяшаліся без прывядзення сур'ёзных аргументаў абвінаваціць "сэцэсію" і яе ўдзельнікаў у правядзенні антыпартыйнай, падрыўной працы, якая заключалася ў патрабаванні стварэння самастойнай, незалежнай ад Кампартыі Польшчы, Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі.

Яшчэ больш жорсткім характарыстыкам у БССР і падпольным камуністычным друку пачала падвяргацца "сэцэсія" пасля рэпрэсіяў у БССР у адносінах да былых членаў БРА. Адзначалася, што "пралезшыя" ў КПЗБ буржуазныя нацыялісты з БРА хутка паспрабавалі правесці раскол у партыі і захоп кіраўніцтва пад выглядам г. зв. "сэцэсіі". "Сэцэсія была контррэвалюцыйнай групай, зарганізаванай правакатарскімі элементамі, якія пралезлі ў партыю і працавалі пад кіраўніцтвам польскай дэфензівы (ахранкі) і буржуазных нацыяналістаў па абодва бакі мяжы (Ігнатоўскі, Гурын-Маразоўскі). Асноўны касцяк "Сэцэсіі" складалі выхадцы з БРА (Сталевіч, Радзевіч, Капуцкі, Гарбацэвіч і інш.). Ідэалогія "Сэцэсіі" поўнасцю вырастала з ідэалогіі БРА."[4]

Прыблізна такога кшталту высноў вымушаны быў прытрымлівацца і былы лідэр БРА І.К. Лагіновіч у сваім артыкуле, прысвечаным праблемам БРА і "Сэцэсіі".[5]

Сур'ёзную ўвагу даследчыкаў у другой палове 20-х - 30-я гады прыцягнула гісторыя ўзнікнення Беларускай сялянска-рабочай грамады, ператварэнне яе ў масавую рэвалюцыйную арганізацыю, сацыяльна-палітычны характар БСРГ, яе роля і значэнне ў

развіцці рэвалюцыйна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі[6]. У працах, прысвечаных Грамадзе, гэтая арганізацыя характарызуецца як самая ўплывовая ў Заходняй Беларусі. Аўтары, знаёмячы з асноўнымі пунктамі праграмы Грамады, даводзілі, што ў яе праграме і дзеяннях пераважала не рабочая, а сялянская ідэалогія, падкрэслівалі дробнабуржуазны, некамуністычны характар БСРГ. Але пры гэтым падкрэслівалася, што Грамада бліжэй за іншыя палітычныя арганізацыі стаіць да партыі пралетарыяту.

Абавязковай бадай што для ўсіх прац была прысутнасць выкрывання "правакацыйных" заяў польскага буржуазнага друку і прадстаўнікоў беларускіх нацыянальна-дэмакратычных партый і арганізацый аб "як быццам бы існуючай сувязі Грамады з камуністычным рухам, удзельнікі якога атрымалі магчымасць легальнай працы". "Дзейнасць і хуткі рост уплыву Грамады ўстрывожыў польскі буржуазны ўрад і грамадскую думку. Увесь польскі буржуазны друк, не выключаючы і левай часткі, адкрыў жорсткую кампанію супраць Грамады, усяляк даказваючы, што гэта партыя з'яўляецца камуністычнай арганізацыяй, і калі прыняла іншую назву, то толькі для таго, каб атрымаць магчымасць легальнай працы." Аўтары папракалі, напрыклад, БХД, якая "сама нямала садзейнічала распаўсюджванню ілжывых чутак аб апошняй (аб Грамадзе) і ўсяляк даказвала дачыненне Грамады да камуністычнага руху і яе антыдзяржаўнай дзейнасці"[7].

Паступова, па меры аддалення ад часу, калі існавала БСРГ, фармулёўкі пачалі крыху мяняцца. "БС-РГ, не зьяўляючыся камуністычнай арганізацыяй, як гэта ёй прыпісвала дэфензіўная ўлада і беларускія нацыянал фашысты, але, аднак, яна была выяўнікам інтарэсаў шырокіх працоўных сялянскіх колаў Заходняе Беларусі",- адзначылі Я. Багданскі і Л. Бабровіч у сваёй працы[8]. А ўжо ў кнізе " Политические партии в Польше, Зап. Белоруссии и Зап. Украине "(Мн., 1935) прама гаворылася: "Пад кіраўніцтвам КПЗБ... вырастае стотысячная баявая нацыянальна-вызваленчая арганізацыя – Грамада".[9]

Значнае месца ў апісанні палітычнай сітуацыі на Заходняй Беларусі адводзілася паказу дзейнасці беларускіх нацыянальна-дэмакратычных партый і арганізацый. Гэты працэс хутчэй за ўсё можна назваць шэльмаваннем, бо дзейнасць гэтых арганізацый і яе членаў увесь час паказвалася рознымі сродкамі як варожая беларускаму народу, згодніцкая ў адносінах да польскіх уладаў. Так, напрыклад, закранаючы дзейнасць БХД, даследчыкі адзначалі, што прапаведуючы беларускую дзяржаўную незалежнасць партыя з'яўляецца непрымірымым ворагам рэвалюцыйнага руху і гатова пайсці на саюз з любой контррэвалюцыйнай сілай, каб толькі пазбегнуць рэвалюцыі, прычым, яна не асабліва рэзка выступае супраць польскай захопніцкай палітыкі. БСС, на думку аўтараў, абараняе інтарэсы кулацкай вярхушкі ў беларускай вёсцы, у якасці лозунга фігуруе "Аб'яднаная незалежная дэмакратычная беларуская рэспубліка".[10] Як бачым, асаблівую насцярожанасць выклікала думка аб стварэнні назалежнай беларускай дзяржавы.

У 30-я гады асвятленне пытанняў палітычных арганізацый адбывалася ў тым самым рэчышчы. БХД і БСС абвінавачваліся ў зрошчванні з фашызмам, выказвалася сцвярджэнне аб іх дыскрыдытацыі ў вачах беларускага народа.[11] Закранаючы пытанні дзейнасці Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў (БПС-Р) і Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (БСДП), даследчыкі даводзілі, што яе дзеячы узначальвалі з цягам часу усе задумкі беларускіх буржуазных нацыяналістаў, якія трывала перайшлі на службу польскага імперыялізму і польскай контрразведкі.[12]

Але неабходна адзначыць, што гэткім чынам шмат было зроблена і на карысць гістарычнай навукі. Азнаёміўшыся і прааналізаваўшы працы, у якіх асвятляліся розныя

бакі дзейнасці такіх арганізацый, як БХД, БСС, іншых, трэба адзначыць, што разам з шматлікімі ідэалагічнымі штампамі, накшталт, "непрымірымыя ворагі рэвалюцыйнай барацьбы", "платныя арганізацыі", "палітычныя адбросы", "беларускія нацыянал-фашысты", "агенты дэфензівы" і іншага, у гэтых працах змешчана шмат карыснай для даследчыкаў інфармацыі, якая дае магчымасць азнаёміцца з асноўнымі праграмнымі ўстаноўкамі і палітычнай практыкай гэтых арганізацый. Галоўная ж думка такіх прац заключалася ў тым, што беларускія нацыянальна-дэмакратычныя партыі і арганізацыі з'яўляюцца злейшымі ворагамі КПЗБ, БСРГ, БССР і не маюць ўплыву сярод шырокіх пралетарскіх і сялянскіх мас[13].

У сярэдзіне 30-х гадоў магутная хваля палітычных рэпрэсій у БССР захапіла сваім крылом і дзеячаў рэвалюцыйнага нацыянальна-вызваленчага руху Заходняй Беларусі. Не пазбеглі такога лёсу і кіраўнікі КПП і КПЗБ. Пастулова ўвесь камуністычны рух у Польшчы быў скампраметаваны, што не магло не адбіцца на асвятленні ў друку пытанняў яе рэвалюцыйнага руху. Колькасць публікацый змяняецца ў бок памяншэння, у іх пакрыху пачынаюць знікаць назвы кампартый Польшчы і Заходняй Беларусі.

У другой палове 30-х гадоў была згорнута дзейнасць Інстытута польскай пралетарскай культуры, Камісіі па вывучэнню Заходняй Беларусі, а таксама Інстытута гісторыі партыі з заходнім сектарам. У 1936 г. замежная мінская частка цэнтральнай рэдакцыі КПЗБ поўнасцю згарнула сваю дзейнасць. Спынілася выданне тэарэтычнага часопіса ЦК КПЗБ "Бальшавік"[14]. Гэтак сама неактуальнай і непатрэбнай станавілася дзейнасць КПП і КПЗБ.

Вынікам рашэння аб роспуску ў 1938 г. КПЗБ, як складовай часткі КПП, стала змяненне акцэнтаў і фармулёвак у беларускай гістарыяграфіі ў асвятленні пытанняў нацыянальна-вызваленчага руху. Гісторыя КПЗБ амаль не вывучалася, палітычнае і арганізацыйнае кіраўніцтва рэвалюцыйнай барацьбой з боку кампартыі ігнаравалася ў большасці публікацый[15].

Выключэннем з гэтага шэрагу з'яўляюцца кніга І.Ф. Лочмеля "Очерки истории борьбы белорусского народа против польских панов"(Мн., 1940) і калектыўная праца "Заходняя Беларусь пад панскім гнётам і яе вызваленне"(Мн., 1940). У апошняй, напрыклад, гаварылася: "У авангардзе рэвалюцыйных баёў ішоў нешматлікі рабочы клас Заходняй Беларусі. Рэвалюцыйнай барацьбой кіравала Камуністычная партыя Заходняй Беларусі, якая працавала ў надзвычай цяжкіх умовах падполля, была акружана шпіенамі і правакатарамі і падвяргалася жорсткі рэпрэсіям"[16].

Змяніліся погляды і на гісторыю БСРГ. Ва ўжо згаданай вышэй працы па пытанню стварэння Грамады сцвярджался, што арганізацыя была створана з дазволу "урада акупантаў", які садзейнічаючы гэтаму "разлічваў узяць яе пад свой нагляд і кіраўніцтва, абясшкодзіць масавы рух, разлажыць яго знутры і, нарэшце, разграміць, ... паставіў на чале Грамады сваіх агентаў-правакатараў з лагеру сваіх прыслужнікаў – беларускіх нацыяналістаў"[17].

У такім рэчышчы асвятленне названых пытанняў адбывалася да сярэдзіны 50-х гадоў[18].

З другой паловы 50-х гадоў у выніку палітычнай рэабілітацыі КПЗБ пачалася актыўная навуковая праца па даследаванню гісторыі кампартыі Заходняй Беларусі. Дастаткова сказаць, што асноўныя праблемы гісторыі КПЗБ і кіруемага ёю рэвалюцыйнага

руху ў 50-80-я гады набылі асвятленне ў 28 кандыдацкіх[19] і 5 доктарскіх дысертацыях, у шматлікіх манаграфіях, брашурах, навуковых і публіцыстычных артыкулах.

Што тычыцца пытанняў дзейнасці беларускіх нацыянальна-дэмакратычных арганізацый, то іх вывучэнне адбывалася ў традыцыях, закладзеных у 20-30-я гады. Так, напрыклад, у першай палове 60-х гадоў была прапанавана і замацавалася тэорыя аб двух лагерах у нацыянальна-вызваленчым руху ў Заходняй Беларусі: лагеру рэвалюцыі і лагеру рэакцыі. Да лагеру рэакцыі былі аднесены беларускія нацыянальна-дэмакратычныя партыі і арганізацыі[20].

Асвятленне названых пытанняў ішло ў рэчышчы марксісцка-ленінскай тэорыі, згодна з якой любы нацыяналізм – беларускі, польскі, яўрэйскі, літоўскі – меў адну і тую ж класавую сутнасць: ён абараняў інтарэсы буржуазіі[21]. Так, у калектыўнай манаграфіі “Революционный путь Компартии Западной Белоруссии” сцвярджалася, што ўплыў буржуазных нацыяналістаў сярод працоўных мас Заходняй Беларусі быў нязначным. Іх лагер уяўляў сабой асобныя, раздробленыя, дробныя групы і партыі, якія аб’ядноўваў толькі страх перад рэвалюцыйнасцю мас і нянавісць да камунізму. Дзейнасць БХД характарызавалася як контррэвалюцыйная, стварэнне ў 1930 г. “Цэнтрасаюза” кваліфікавалася як спроба аб’яднання ўсіх беларускіх нацыяналістаў, уключэнне іх у барацьбу з рэвалюцыйным рухам[22].

У 1976 г. у выглядзе брашуры была апублікавана праца У.Ф. Ладысева, прысвечаная непасрэдна асвятленню гісторыі стварэння, ролі беларускіх нацыянальна-дэмакратычных партый і арганізацый. Іх дзейнасць асвятлялася ў духу вышэйадзначаных падыходаў[23].

Адмоўная ацэнка дзейнасці арганізацый нацыянальна-дэмакратычнай плыні ўтрымлівалася і ў іншых працах[24].

Такім чынам, пытанні дзейнасці палітычных партый і арганізацый ў Заходняй Беларусі ў 1921-1939 гг. атрымалі ў 20-80-я гады значнае асвятленне. Неабходна адзначыць, што на распрацоўку гэтых праблем моцнае ўздзеянне аказвала грамадска-палітычная сітуацыя ў краіне, імкненне партыйна-дзяржаўных структур накіраваць даследаванне гэтых пытанняў у неабходнае рэчышча для задавальнення сваіх ідэалагічных патрэб. Гэта прыводзіла да нераўнамернасці ў вывучэнні пытанняў палітычных партый рознай накіраванасці, навешвання ганебных ярлыкоў, суб’ектывізму, схематызму і заідэалагізаванасці.

---

[1] Гл.: Астрога В.А. «Шпіёнскае гняздо»:Стварэньне і дзейнасьць Камісіі па вывучэньні Заходняе Беларусі // Спадчына. – 1996. - № 6. – С. 156-167; Ён жа. Вывучэнне польскай гісторыі на Беларусі (1921-1941 гг.) // Берасцейскі хранограф: Зб. навук. прац. Вып. 2. – Брэст, 1999. – С. 254-255; Вахтомаў Г.В., Міхнюк У.М. Станаўленне гістарыяграфіі рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі // Весці АН БССР. Серыя грамадскіх навук. – 1988. - № 5. – С. 118-125.

[2] Валевіч І.Р. Першыя гады Кампартыі Заходняй Беларусі. Успаміны падпольшчыка. 1921-1925 гг. – Мн., 1935.

[3] Политические партии в Польще, Зап. Белоруссии и Зап. Украине. – Мн., 1935. – С.265-266.

[4] Там сама. – М., 1935. – С. 266.

[5] Корчык П. Нацыянал-апартунізм у КПЗБ і ідэалагічная спадчына «Беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі» // Бальшавік Беларусі. – 1934. – № 7. – С. 35-43.

[6] Беларуская сялянска-работніцкая грамада. – Менск: Дзяржвыдавецтва, 1928. – 54 с.; Западная Белоруссия. Сб. статей. Кн. 1. – Мн., 1927; Западная Белоруссия на скамье подсудимых. Процесс Белорусской Крестьянско-Рабочей Громады. – Мн., 1929; Багданскі Я., Бабровіч Л. Аб клясавай барацьбе ў Заходняй Беларусі ў часы Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады. – Мн., 1932 і інш.

[7] Западная Белоруссия. Сб. статей. Кн. 1. – Мн., 1927. – С. 211, 206.

[8] Багданскі Я., Бабровіч Л. Аб клясавай барацьбе ў Заходняй Беларусі ... – С. 23.

[9] Политические партии в Польше, Зап. Белоруссии ... – С. 25.

[10] Западная Белоруссия. Сб. статей. ... – С. 206

[11] Багданскі Я., Бабровіч Л. Аб клясавай барацьбе ў Заходняй Беларусі ... С. 32-35, 60-63.

[12] Политические партии в Польше, Зап. Белоруссии... – С. 264.

[13] Некрашэвіч А. Беларускі нацыянал-фашызм і нацыянал-дэмакратызм. – Менск, 1929. – 18с.; Ён жа. Беларускі нацыянал-фашызм і яго сабрат беларускі нацыянал-дэмакратызм // Бальшавік Беларусі. – 1929. – № 10-12. – С. 83-90; Сталевіч А. Беларускі нацыянал-фашызм. Яго вытокі, тэорыя і практыка. – Мн., 1930.

[14] Орехво Н.С. Дела и люди КПЗБ. – Мн., 1983. – С. 209.

[15] Гарбуноў Т. Год пад сцягам саветаў. – Мн., 1940; Егоров Г. Западная Белоруссия. – М., 1939; Пичета В. Исторические судьбы Западной Украины и Западной Белоруссии. – М., 1939.

[16] Заходняя Беларусь пад панскім гнётам і яе вызваленне. – Мн., 1940. – С. 58.

[17] Там сама. – С. 56.

[18] Воссоединение белорусского народа в едином советском социалистическом государстве. – М., 1948. – С. 134-139; Царюк А.В. Борьба трудящихся Западной Белоруссии за свое освобождение (1921-1927 гг.) // Сб. научных работ. Мн,: Изд-во БГУ, 1958. Вып. 1(40). – С. 134.

[19] Михнюк В.Н. Кандидатские и докторские диссертации по историческим наукам БССР. 1944-1987 гг. – Мн., 1988. – С. 19.

[20] Полуян В.А., Полуян И.В. Революционное и национально-освободительное движение в Западной Белоруссии в 1920-1939 гг. – Мн., 1962. – С. 6.

[21] Ленин В.И. Полн. Собр. соч. Т. 24. – С. 122.

[22] Революционный путь Компартии Западной Белоруссии (1921-1939 гг.). – Мн., 1966. – С. 222-223.

[23] Ладысеў У.Ф. Насуперак волі народа: З гісторыі палітычнага банкруцтва беларускіх нацыяналістычных партый і арганізацый у Заходняй Беларусі. – Мн., 1976.

[24] Полуян В.А. Революционно-демократическое движение в Западной Белоруссии (1927-1939 гг.). – Мн., 1978. – С. 42-43; Зелинский П.И. Политическая работа КПЗБ в массах, 1923-1938. – Мн., 1986. – С. 15; Мараш Я.И. Политика Ватикана и католической церкви в Западной Белоруссии (1918-1939 гг.). – Мн., 1983. – С. 54-61 і інш.